# МІНСК ГІСТАРЫЧНЫ: станаўленне беларускай дзяржаўнасці

## *Квэст па старонках "Беларускага гістарычнага часопіса"*

*На працягу 2017—2018 гадоў у Рэспубліцы Беларусь ладзяцца мерапрыемствы, прысвечаныя падзеям 1917—1919 гг., што паклалі пачатак станаўленню сучаснай беларускай дзяржавы. Для больш дэталёвага знаёмства студэнтаў гістарычнага факультэта БДПУ імя Максіма Танка з названымі гістарычнымі падзеямі, мясцінамі, дзе яны адбываліся, развіцця іх вучэбных і даследчых кампетэнцый кафедра ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі ўніверсітэта і студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя (СНДЛ) "Кліа" сумесна з рэдакцыяй "Беларускага гістарычнага часопіса" арганізавалі квэст па памятных месцах беларускай сталіцы, звязаных з пачаткамі станаўлення сучаснай беларускай дзяржавы.*

Квэст (пошук) (ад англ. quest — "пошук, прадмет пошукаў, пошук прыгод, выкананне рыцарскага зароку") — адзін са спосабаў пабудовы сюжэта ў літаратурных творах, які ўяўляе сабой падарожжа персанажаў да сваёй мэты праз пераадоленне цяжкасцяў. Ён асабліва актыўна выкарыстоўваецца ў жанры фэнтэзі. Паколькі гэты жанр цесна звязаны з ролевымі гульнямі, то гэтае паняцце перайшло ва ўжытак у гульнявой сферы. Квэст — гэта інтэрактыўная гульня з сюжэтнай лініяй, якая заключаецца ў вырашэнні розных галаваломак і лагічных заданняў. Доўгі час папулярнай забавай моладзі былі онлайн-квэсты, цяпер усё большую цікавасць выклікаюць так званыя "жывыя" квэсты.

Адным з падобных квэстаў з'яўляецца гарадское арыентаванне — інтэлектуальна-экстрэмальны від гульняў на вуліцах горада, які атрымаў шырокае распаўсюджванне ў пачатку XXI стагоддзя. Мэтай яго ўдзельнікаў з'яўляецца пошук і дасягненне за самы кароткі час зададзеных арганізатарамі кантрольных пунктаў. У адрозненне ад класічнага спартыўнага гарадское арыентаванне можа мець некалькі спосабаў задавання кантрольных пунктаў. Гэта могуць быць адрасы, мясцовыя назвы і арыенціры, уласцівыя гарадскому ландшафту, умоўныя схемы і фатаграфіі, камбінаваныя апісанні і гарадскія загадкі. Астатнія правілы і ўмовы агаворваюцца ў залежнасці ад самога спаборніцтва.

Квэст "Мінск гістарычны: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (па старонках "Беларускага гістарычнага часопіса")" для студэнтаў першага і другога курсаў гістарычнага факультэта БДПУ, што навучаюцца па спецыяльнасці "Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа", адбыўся ў маі 2018 г. Каманды вызначаліся па выніках адборачнага тура — віктарыны па гісторыі Беларусі ў форме "Сваёй гульні" *(гл. дадатак 1)*. Пытанні да яе складалі ўдзельнікі студэнцкай лабараторыі Арцём Карасевіч, Павел Алісіевіч, Антон Доўнар і Дзмітрый Карпік. Па выніках віктарыны каманду першага курса склалі Савелій Суботка, Святлана Бойка, Ганна Хахлова і Дар'я Вішнеўская, другога курса — Аляксандра Мароз, Паліна Гардзейчык, Андрэй Марозаў, Надзея Зямлянік і Вольга Шэстак.

Арганізатары квэста ставілі наступныя мэты:

1. Стварыць умовы для паглыбленага знаёмства студэнтаў з экскурсійна-краяўнаўчым патэнцыялам памятных мясцін у Мінску, звязаных з гісторыяй беларускай дзяржаўнасці.

2. Садзейнічаць фарміраванню прафесійных кампетэнцый будучых настаўнікаў гісторыі (самастойная работа з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі, аналіз пісьмовых і візуальных тэкстаў, фармулёўка і аргументацыя высноў і інш.).

3. Спрыяць азнаямленню студэнтаў са зместам публікацый "Беларускага гістарычнага часопіса", фарміраванню іх чытацкай і інфармацыйнай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

культуры, далучэнню ўдзельнікаў да дзейнасці студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі "Кліа".

Для паспяховага праходжання квэста ўдзельнікам каманд было неабходна прачытаць некалькі артыкулаў, надрукаваных у "Беларускім гістарычным часопісе", вывучыць шэраг дакументальных і фотаматэрыялаў па тэме: матэрыялы беларускіх гісторыкаў — В.Волкавай "Мінск 21 лютага 1918 г. вачыма нямецкага салдата *(па матэрыялах газеты "Zeitung der 10. Armee")*" (2018. № 2. С. 9—12), В.Мазеца "Беларуская Народная Рэспубліка: асноўныя вехі станаўлення" (2018. № 3. С. 19—24), Р.Лазько "Савецкая рэспубліка для Беларусі" (2018. № 3. С. 37—46); ілюстрацыі змешчаныя ў № 2, 3 часопіса за 2018 г.

Галоўным рэдактарам "Беларускага гістарычнага часопіса" М.Н.Гальпяровічам і намеснікам галоўнага рэдактара Н.У.Матусевіч былі складзены адпаведныя маршрутныя лісты для дзвюх каманд. З гэтымі лістамі каманды адначасова з першым заданнем стартавалі ад галоўнага ўваходу ў БДПУ. Удзельнікам неабходна было правільна вызначыць прапанаваны ў заданні гістарычны аб'ект і схему свайго руху да яго. Дасягнуўшы аб'екта, яны адказвалі арганізатарам квэста, якія іх чакалі, што гэта за гістарычны будынак, пасля атрымлівалі наступнае заданне *(гл. дадатак 2)*.

У якасці аб'ектаў, у якіх адбыліся лёсавызначальныя для беларускай дзяржаўнасці падзеі, былі абраныя будынак Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (вул. Энгельса, 7), дзе з 5 па 18 снежня 1917 года праходзіў І Усебеларускі з'езд; былы дом губернатара на плошчы Свабоды, у якім была абвешчаная ІІ Устаўная грамата БНР; былое Мінскае аддзяленне Пазямельна-сялянскага банка ў доме Маліных (вул. Валадарскага, 9), у якім была абвешчаная ІІІ Устаўная грамата БНР, і Дом урада (вул. Савецкая, 11).

Хуткасць і правільнасць выканання заданняў квэста, паўнату і глыбіню адказаў на пытанні ацэньвалі загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі педагагічнага ўніверсітэта А.А.Корзюк, супрацоўнікі рэдакцыі "Беларускага гістарычнага часопіса" галоўны рэдактар М.Н.Гальпяровіч, намеснік галоўнага рэдактара Н.У.Матусевіч, рэдактар аддзела В.К.Чаропка, а таксама члены СНДЛ "Кліа" Антон Доўнар, Арцём Карасевіч, Павел Алісіевіч і Рыгор Сезін *(гл. дадатак 3)*.

Па выніках выканання ўсіх заданняў пераможцам квэста была прызнаная каманда другога курса. Пры падвядзенні вынікаў мерапрыемства ўдзельнікі адзначылі карыснасць, інтэрактыўнасць і практычнае значэнне квэста. Пасля чытання артыкулаў часопіса, аналізу адпаведных ілюстрацый, удзелу ў тэматычным квэсце перакаваліся, што ў Мінску захаваліся гістарычныя будынкі, у якіх адбываліся значныя падзеі звязаныя са станаўленнем беларускай дзяржавы.

Удзельнікі, пераможцы і студэнты-арганізатары квэста, былі ўзнагароджаныя адпаведнымі дыпломамі і падарункамі — экзэмплярамі "Беларускага гістарычнага часопіса", пасля чаго змаглі ўзяць аўтографы ў членаў рэдакцыйнай рады і сталых аўтараў часопіса А.А.Корзюка і В.К.Чаропкі. У новым навучальным годзе каманды выказалі жаданне зноў паспрабаваць свае сілы ў тэматычным квэсце з будучымі першакурснікамі.

*Дадатак 1*

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Культура Беларусі** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 100 |
| **Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 100 |
| **Гістарычныя асобы** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 100 |
| **Рэлігійнае жыццё на Беларусі** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 100 |
| **Помнікі архітэктуры** | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 100 |

*Гульнявое поле інтэлектуальнай гульні "Свая гульня".*

## Пытанні віктарыны па гісторыі Беларусі

### *Блок 1. Культура Беларусі*

1.1. Што гэта за помнік мастацтва?

Гэты шэдэўр беларускага мастацтва быў выраблены ў сярэдзіне XII ст. Страчаны ў сярэдзіне XX ст., а яго копію зрабілі ў 1997 г.

*(Крыж Еўфрасінні Полацкай) — 10 балаў.*

1.2. Што гэта за прадмет?

Элемент мужчынскага касцюма ў ВКЛ. Лічыўся прыкметай высакароднага паходжання. Яго наяўнасць сведчыла пра дабрабыт уладальніка.

*(Слуцкі пояс) — 20 балаў.*

1.3. Аб якім помніку архітэктуры ідзе гаворка?

Ён быў узведзены ў канцы XIII ст. у раманскім стылі. З'яўляецца абаронча збудаваннем. Размяшчаецца на поўдні Беларусі.

*(Камянецкая вежа) — 30 балаў.*

1.4. Аўтар карціны "Над горадам" атрымаў традыцыйную хатнюю яўрэйскую адукацыю — вывучаў старажытнаяўрэйскую мову, Тору і Талмуд. У 1906 г. вучыўся выяўленчаму мастацтву ў мастацкай школе віцебскага жывапісца Юдаля Пэна, затым пераехаў у Пецярбург. Назавіце аўтара карціны.

*(Марк Шагал) — 40 балаў.*

1.5. Архітэктар касцёла Святога Сымона і Святой Алены. Скончыў у 1886 г. гімназію ў Срэме,



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

да 1890 г. вывучаў архітэктуру ў політэхнічным інстытуце ў Шарлотэнбургу пад кіраўніцтвам К.Шэфера. Назавіце яго.

*(Томаш Паяздзерскі) — 50 балаў.*

1.6. Аўтар карціны "Чорная быль" — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1951 г. скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, затым Маскоўскі мастацкі інстытут імя. В.І.Сурыкава.

*(Міхаіл Савіцкі) — 100 балаў.*

### *Блок 2. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі*

2.1. Гэтая бітва адбылася паміж Усяславам Брачыславічам і братамі Ізяславам, Святаславам і Усеваладам Яраславічамі. Назавіце яе.

*(Бітва на Нямізе) — 10 балаў.*

2.2. Дзякуючы перамозе ў гэтай бітве на чале з вялікім князем літоўскім Альгердам украінскія землі былі вызваленыя ад мангола-татар і ўключаныя ў склад ВКЛ. Што гэта за бітва?

*(Бітва на рацэ Сінія Воды) — 20 балаў.*

2.3. Які горад і чаму называюць "рускім Вердэнам"?

*(Смаргонь. У раёне Смаргоні 5-6 верасня 1916 г. германскія войскі выкарысталі газ супраць 3-й гвардзейскай дывізіі рускай арміі. Упершыню такі газ быў ужыты германскімі войскамі супраць французскіх войскаў у лютым 1916 г. каля французскага горада Вердэн) — 30 балаў.*

2.4. Гэтая буйнамаштабная наступальная аперацыя Вялікай Айчыннай вайны адбылася на тэрыторыі Беларусі ў 1944 г. і названа ў гонар расійскага палкаводца вайны 1812 года. Назавіце яе.

*(Аперацыя "Баграціён") — 40 балаў.*

2.5. Галоўнай мэтай гэтага паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы было адраўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Адным з пароляў паўстанцаў былі словы "Каго любіш?" — "Люблю Беларусь! Так узаемна!". Што гэта за паўстанне?

*(Паўстанне Кастуся Каліноўскага 1863—1864 гг.) — 50 балаў.*

2.6. У дзень 31 студзеня гэты беларускі горад быў узяты ў аблогу. На дапамогу гораду з Мінска выступіла войска ВКЛ пад камандаваннем вялікага гетмана Мікалая Радзівіла Рудога. Камандуючы абаронай горада здзейсніў памылку — загадаў спаліць Вялікі Астрог і адступіць у замак. Крыху пазней горад быў захоплены. Што гэта за падзея?

*(Узяцце Полацка расійскім войскам у 1563 г.) — 100 балаў.*

### *Блок 3. Гістарычныя асобы*

3.1. Хто быў першым сакратаром ЦК Кампартыі БССР у 1965—1980 гг.?

*(Пётр Міронавіч Машэраў) — 10 балаў.*

3.2. Абвешчаны каралём гусітаў. Адзін з найбольш вядомых кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага, яшчэ пры жыцці празваны Вялікім. Хто гэта?

*(Вялікі князь літоўскі Вітаўт) — 20 балаў.*

3.3. Паэт. У 1521 г. у якасці прыдворнага суправаджаў біскупа Эразма Цёлака ў Рым, дзе напісаў свой знакаміты твор. Назавіце гэтага гістарычнага дзеяча.

*(Мікола Гусоўскі) — 30 балаў.*

3.4. Кароль Рэчы Паспалітай, які актыўна падтрымліваў езуітаў, бо іх адукацыйная сістэма лічылася лепшай у Еўропе. Пабудаваў езуіцкія калегіумы ў Нясвіжы і Полацку. Хто гэта?

*(Стафан Баторый) — 40 балаў.*

3.5. Адзін з яго твораў — малюнак Нясвіжскага замка Радзівілаў — быў размешчаны на беларускай банкноце наміналам 100 000 рублёў узору 2000 г. Хто аўтар гэтага малюнка?

*(Напалеон Орда) — 50 балаў.*

3.6. Хто з ураджэнцаў Беларусі стаў першым прэзідэнтам Гавайскай Рэспублікі?

*(Мікалай Судзілоўскі) — 100 балаў.*

### *Блок 4. Рэлігійнае жыццё на Беларусі*

4.1. У якім горадзе і калі на беларускіх землях была заснавана першая епархія?

*(У Полацку ў 992 г.) — 10 балаў.*

4.2. Пасля распаду Савецкага Саюза і зняцця абмежаванняў на рэлігійнае жыццё папа рымскі Ян Павел ІІ прызначыў першага кардынала за ўсю гісторыю каталіцкай царквы ў Беларусі. Назавіце яго.

*(Казімір Свёнтак) — 20 балаў.*

4.3. Назавіце другую назву ўніяцкай царквы, утворанай у 1596 г.

*(Грэка-каталіцкая) — 30 балаў.*

4.4. Назавіце культавы будынак архітэктара Яна Марыі Бернардоні, узведзены ў Нясвіжы ў канцы XVI ст.?

*(Касцёл Божага Цела) — 40 балаў.*

4.5. У якім населеным пункце знаходзіцца Мінская праваслаўная духоўная семінарыя?

*(У в. Жыровіцы, Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці) — 50 балаў.*

4.6. Назавіце сучасных кіраўнікоў праваслаўнай, каталіцкай і ўніяцкай цэркваў на Беларусі.

*(Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, архіепіскап-мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч і апостальскі візітатар для грэка-католікаў на Беларусі архімандрыт Ян Сяргей Гаек) — 100 балаў.*

РЭПОЗІТОРЫЙ БГТУ



Арганізатары і ўдзельнікі квэста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Блок 5. Помнікі архітэктуры*

**5.1. Які культавы будынак першым мураваным храмам на тэрыторыі Беларусі лічыцца?**

***(Сабор Святой Сафіі ў Полацку) — 10 балаў.***

**5.2. У гэтым культавым будынку штогод у пачатку ліпеня ладзіцца фэст, прысвечаны ўшанаванню цудатворнага абраза Маці Божай, апякунамі якога з'яўляюцца манахі капуцыны. Назавіце будынак і месца яго знаходжання.**

***(Касцёл бернардынцаў у в. Будслаў) — 20 балаў.***

**5.3. Гэты будынак з'яўляецца ў цяперашні час найважнейшым у Беларусі адміністрацыйным будынкам пасля палаца Незалежнасці. Яго блізкая копія ўзведзена ў Магілёве. Назавіце гэты будынак.**

***(Дом Урада) — 30 балаў.***

**5.4. Гэты культавы будынак пасля Вялікай Айчыннай вайны належаў кінастудыі "Беларусьфільм". Цяпер ён вернуты вернікам. З'яўляецца папулярным турыстычным аб'ектам і адным з сімвалаў Мінска. Назавіце гэты будынак.**

***(Касцёл Святых Сымона і Алены (Чырвоны касцёл)) — 40 балаў.***

**5.5. Гэты мураваны будынак, які меў гатычныя рысы, быў узведзены замест драўлянага замка, што згарэў у 1398 г. Што гэта за будынак?**

***(Гродзенскі замак) — 50 балаў.***

**5.6. Гэты будынак выконваў абарончую функцыю. У вышыню ён быў каля 31 метра, меў вонкавы дыяметр 13,5 м, цалкам пабудаваны з цэглы, якая пакладзена метадам "два лажкі і адзін тычок", што адпавядае балтыйскай муроўцы. Ён узведзены па загадзе валынскага князя Уладзіміра Васількавіча і згадваецца ў летапісе як пагранічны апорны пункт. Што гэта за будынак?**

***(Камянецкая вежа) — 100 балаў.***

*Дадатак 2*

**<u>МАРШРУТ 1</u>**

**Шаноўныя ўдзельнікі квэста!**

**На аснове папярэдне прапанаваных тэкстаў і ілюстрацый з "Беларускага гістарычнага часопіса" выканайце заданні квэста: знайдзіце будынкі, у якіх адбываліся лёсавызначальныя для станаўлення беларускай дзяржаўнасці падзеі, назавіце гэтыя падзеі арганізатарам квэста. Адзначце іх у свой маршрутны ліст. Жадаем поспехаў!**

***<u>Заданне 1.</u>***

**Напрыканцы 1917 года ў храме Мельпамены, пабудаваным у Мінску ў апошняй трэці XIX ст. на грошы жыхароў горада, адбыўся прадстаўнічы сход, на якім было ўзнятае пытанне аб беларускай дзяржаўнасці.**

**Прайдзіце па вуліцы, названай у гонар стваральніка вядомага філасофскага, эканамічнага і палітычнага вучэння, да апісанага будынка, адкажыце арганізатару квэста, што гэта за будынак і якая падзея ў ім адбылася. Атрымайце наступнае заданне.**

***Заданне 2.***

На гэтай плошчы Мінска ў XIX — пачатку XX ст. размяшчаліся будынкі, якія сімвалізавалі дзяржаўную ўладу Расійскай Імперыі, а таксама культавыя будынкі. Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 года ў адным з будынкаў, што знаходзіцца на гэтай плошчы, адбылося падпісанне першага дакумента, звязанага з абвяшчэннем беларускай дзяржавы.

Прайдзіце па вуліцы, названай у гонар аднаго са стваральнікаў вядомага філасофскага, эканамічнага і палітычнага вучэння (паплечніка вышэйзгаданага), на гэтую плошчу, знайдзіце будынак, у якім быў падпісаны згаданы дакумент, і адкажыце арганізатару квэста, што гэта за будынак і якая падзея ў ім адбылася. Атрымайце наступнае заданне.

***Заданне 3.***

У 1918 годзе ў Мінску ўпершыню ў гісторыі была абвешчана незалежная беларуская дзяржава. Яе заснавальнікі прынялі некалькі дакументаў пад назвай "устаўная грамата".

Прайдзіце ў напрамку вашай alma mater па вуліцы Інтэрнацыянальнай і знайдзіце будынак на адной з прылягаючых да праспекта Незалежнасці вуліц, у якім была прынята трэцяя падобная грамата. Адкажыце арганізатару квэста, што гэта за будынак і якая падзея ў ім адбылася. Атрымайце наступнае заданне.

***Заданне 4.***

Гэты будынак быў узведзены ў міжваенны перыяд. На сённяшні дзень у ім знаходзяцца галоўныя дзяржаўныя ўстановы нашай краіны.

Рушце на плошчу Незалежнасці, падыдзіце да помніка гістарычнаму дзеячу, які паўплываў на ход гісторыі XX ст., недалёка ад гэтага будынка. Раскажыце арганізатару квэста, што гэта за будынак і хто яго спраектаваў. Пасля выканання задання падыдзіце да вашай навучальнай установы і вярніце маршрутны ліст арганізатарам квэста.

**МАРШРУТ 2**

**Шаноўныя ўдзельнікі квэста!**

На аснове папярэдне прапанаваных тэкстаў і ілюстрацый з "Беларускага гістарычнага часопіса" выканайце заданні квэста: знайдзіце будынкі, у якіх адбываліся лёсавызначальныя для станаўлення беларускай дзяржаўнасці падзеі, назавіце гэтыя падзеі арганізатарам квэста. Адзначце іх у свой маршрутны ліст. Жадаем поспехаў!

***Заданне 1.***

У 1918 годзе ў Мінску ўпершыню ў гісторыі была абвешчана незалежная беларуская дзяржава. Яе заснавальнікі прынялі некалькі дакументаў пад назвай "устаўная грамата".

Прайдзіце з плошчы Незалежнасці ўздоўж гасцініцы "Мінск", павярніце ўлева на бліжэйшую вуліцу і знайдзіце будынак, у якім была прынята трэцяя падобная грамата. Адкажыце арганізатару квэста, што гэта за будынак і якая падзея ў ім адбылася. Атрымайце наступнае заданне.

***Заданне 2.***

На гэтай плошчы Мінска ў XIX — пачатку XX ст. размяшчаліся будынкі, якія сімвалізавалі дзяржаўную ўладу Расійскай Імперыі, а таксама культавыя будынкі. Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 года ў адным з будынкаў, што знаходзіцца на гэтай плошчы, адбылося падпісанне першага дакумента аб абвяшчэнні беларускай дзяржавы.

Прайдзіце з вуліцы Валадарскага па вуліцы Інтэрнацыянальнай на гэтую плошчу, знайдзіце будынак, у якім быў падпісаны згаданы дакумент, і адкажыце арганізатару квэста, што гэта за будынак і якая падзея ў ім адбылася. Атрымайце наступнае заданне.

***Заданне 3.***

Напрыканцы 1917 года ў храме Мельпамены, пабудаваным у Мінску ў апошняй трэці XIX ст. на грошы жыхароў горада, адбыўся прадстаўнічы сход, на якім было ўзнятае пытанне аб беларускай дзяржаўнасці.

Прайдзіце па вуліцы, названай у гонар першага кіраўніка Савецкай Расіі, да вуліцы, названай імем стваральніка вядомага філасофскага, эканамічнага і палітычнага вучэння, да апісанага будынка, адкажыце арганізатару квэста, што гэта за будынак, і якая падзея ў ім адбылася. Атрымайце наступнае заданне.

***Заданне 4.***

Гэты будынак быў узведзены ў міжваенны перыяд. На сённяшні дзень у ім знаходзяцца галоўныя дзяржаўныя ўстановы нашай краіны.

Рушце на плошчу Незалежнасці, падыдзіце да помніка гістарычнаму дзеячу, які паўплываў на ход гісторыі XX ст., недалёка ад гэтага будынка. Раскажыце арганізатару квэста, што гэта за будынак і хто яго спраектаваў. Пасля выканання задання падыдзіце да вашай навучальнай установы і вярніце маршрутны ліст арганізатарам квэста.

*Дадатак 3*

**Маршрутны ліст каманды**

| Назва пункта, час прыходу каманды | Каментарыі і подпіс арганізатара |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| Агульная колькасць балаў | |

*Матэрыял падрыхтаваў Аляксандр КОРЗЮК.*